еццa ў свеце палітыкі. У той жа час прафесійны чыноўнік, які з самага пачатку знаходзіцца на адміністрацыйнай рабоце, не разумее спецыфікі сферы культуры як аб’екта кіравання. Вырашэнне дадзенага пытання залежыць ад эфектыўнай распрацоўкі сістэмы падрыхтоўкі высокаадукаваных, прафесійна падрыхтаваных чыноўнікаў культурнай сферы. Неабходна заўважыць, што ў адрозненні ад іншых сфер падрыхтоўка кадраў дзяржаўных служачых у названай сферы практычна не здзяйснялася па спецыяльных праграмах. Напрыклад, у Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь у 2007 г. вялася падрыхтоўка спецыялістаў па спецыяльнасці «Дзяржаўнае рэгуляванне нацыянальнай эканомікі», падрыхтоўку спецыялістаў для кіравання сацыяльна-культурнай сферай дадзеная ўстанова не здзяйсняла. Інстытут дзяржаўнай службы Акадэміі кіравання вёў перападрыхтоўку кіруючых работнікаў і асоб, уключаных у кадравы рэзерв, па такіх спецыяльнасцях, як «Дзяржава і мясцовае кіраванне» і «Дзяржаўнае кіраванне сацыяльнай сферай» з прысваеннем аднолькавай кваліфікацыі – «Спецыяліст у галіне дзяржаўнага кіравання». Акрамя гэтага, перападрыхтоўка вялася па блізкай да культурнай галіны спецыяльнасці «Дзяржаўнае кіраванне і ідэалогія» з прысваеннем кваліфікацыі «Ідэолаг».

Прааналізаваныя механізмы знаходзіліся ва ўзаемадзеянні і аказвалі ўплыў адзін на аднаго. Пры гэтым іх дзейнасць была накіравана на рэалізацыю адзінай мэты: захаванне і развіццё культуры грамадства ва ўсёй яе складанай сукупнасці.

***М. Л. Кузьмініч,***
*кандыдат педагагічных навук, дацэнт,*
*загадчык кафедры педагогікі*
*Мінскага гарадскога інстытута*
*развіцця адукацыі*

## МУЗЫЧНАЕ МАСТАЦТВА Ў ЗМЕСЦЕ МАСТАЦКАЙ АДУКАЦЫІ: ПРАБЛЕМА ПЕРАЕМНАСЦІ І БЕСПЕРАПЫННАСЦІ

Змест музычнага навучання з’яўляецца важнейшым элементам цэласнага музычна-адукацыйнага працэсу. Гэта педагагічна пабудаваны музычны і духоўны вопыт чалавецтва, адлюстраваны не толькі ў вучэбных планах, праграмах, падручніках і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дапаможніках, але і ў музычных хрэстаматыях і музычным вучэбным рэпертуары.

У змесце музычнага навучання вылучаюцца наступныя элементы [1, с. 68–82]: музычныя веды; музычныя ўменні і навыкі; сістэма эмацыянальна-маральных адносін чалавека да грамадства, прыроды, да іншых людзей і самога сябе, увасобленых у музычных вобразах (сацыяльныя нормы жыцця ў грамадстве, адлюстраваныя ў музычных творах спецыфічнымі сродкамі музычнага мастацтва; выхаваўчая накіраванасць педагагічнага рэпертуару); вопыт музычнай творчасці і творчай вучэбнай дзейнасці. Да гэтага пераліку мы дадаем нацыянальную і агульначалавечую музычную спадчыну ў форме музычных твораў, якія складаюць педагагічны рэпертуар і ўвасабляюць адзінства духоўнага і мастацкага вопыту чалавецтва [3, с. 111–115].

Нацыянальная і агульначалавечая музычная спадчына ў форме музычных твораў, якія складаюць педагагічны рэпертуар (народная музыка, класіка, сучасная музыка; творы свецкай, рэлігійнай і народнай накіраванасці), уяўляе важнейшы кампанент зместу музычнага навучання. Творы музычнага мастацтва ва ўсёй сваёй разнастайнасці (опус-культура грамадства) становяцца прадметам уважлівага разгляду і вывучэння як прыклады высокамастацкага ўвасаблення чалавечых пачуццяў і думак, як ўзоры прафесійнага, наватарскага выкарыстання сродкаў музычнай выразнасці, элементаў музычнай мовы для ўвасаблення разнастайных музычных вобразаў, для паказу дынамікі іх развіцця і ўзаемадзеяння.

Вучыць музыцы – гэта значыць вучыць музычнаму адчуванню (эмацыянальная сфера асобы), музычнаму мысленню (інтэлектуальная сфера), музычнай дзейнасці і творчасці (валявая сфера) ў іх цэласнасці і адзінстве. Вучыць музыцы – гэта значыць забяспечыць развіццё асобы навучэнца ў адзінстве ўсіх яе функцыянальных механізмаў псіхікі і сукупнасці агульных і музычных здольнасцей. Вучыць музыцы – гэта значыць забяспечыць адукацыю чалавека як цэласнае трыадзінства яго навучанасці, выхаванасці і развітасці.

У той жа час выкарыстанне музычных твораў у адукацыйным працэсе шматварыянтна ў залежнасці ад таго, якую мэту ставіць перад сабой педагог, якія задачы ён імкнецца вырашаць. Творы музычнага мастацтва (вучэбны і вучэбна-канцэртны рэпертуар) могуць ператварыцца: у сродак навучання – сродак асваен-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ня мовы мастацтва, фарміравання пэўных відаў выканальніцкай тэхнікі, засваення прыёмаў ігры на інструменце (вакальна-харавых навыкаў) ці выканальніцкіх штрыхоў; у сродак выхавання – фарміравання сістэмы адносін асобы, пэўных яе якасцей (такое адбываецца пры забеспячэнні засваення эмацыянальна-сэнсавага зместу музычных вобразаў з пункту гледжання дамінуючых у грамадстве агульначалавечых і нацыянальных духоўна-маральных каштоўнасцей); у сродак псіхафізічнага развіцця чалавека (развіцця яго маторыкі і псіхаматорыкі, агульных і агульна-эстэтычных музычных здольнасцей, функцыянальных механізмаў псіхікі, сферы падсвядомага і інтуітыўнага; у сродак псіхатэрапіі – гарманізацыі, заспакаення ці, наадварот, актывізацыі ўнутраных сіл чалавека; у сродак рэлаксацыі і геданізму; у сродак катарсісу, ачышчэння; сродак атрымання эстэтычнай асалоды ад успрымання гукаў, акордаў, тэмбраў і іншых элементаў музычнай мовы, якія ў сваёй сукупнасці ўтвараюць непаўторны музычны вобраз, які жыве ў часе і прасторы, камунікацыя з якім выклікае пачуццё захаплення. Нарэшце, музычныя творы могуць разглядацца і як феномен музычнага мастацтва і мастацтва наогул, і як з'ява грамадскага жыцця ў трыадзіным працэсе стварэння – выканання – успрымання музыкі, ў адзіным працэсе фарміравання і праяўлення пачуццяў – думак – паводзін, у шматаспектным працэсе ўзаемадзеяння музычнага вобраза і чалавека.

Музычны твор у адукацыйным працэсе не проста сродак навучання, выхавання ці развіцця асобы. Гэта своеасаблівы зрэз мастацкай эпохі з уласцівымі ёй стылямі і жанрамі, вобразамі і думкамі, сродкамі іх увасаблення. Класічныя творы музычнага мастацтва ператвараюцца ў важнейшы элемент зместу музычнай адукацыі нараўне з ведамі, уменнямі і навыкамі, нараўне з вопытам у галіне розных відаў музычнай дзейнасці і вопытам творчасці. Калі вучань засвойвае веды аб музычнай культуры грамадства, то музычны твор – ёсць адлюстраванне гэтых ведаў. Засваенне гэтага твора ў працэсе ўспрымання – выканання – інтэрпрэтацыі – ёсць засваенне зместу, бо музычныя творы ператвараюцца ў змест музычнай адукацыі.

Твораў існуе шмат. Некаторыя з іх (як правіла, класічныя) становяцца аб'ектам неаднаразовага вывучэння ў межах розных вучэбных дысцыплін вучэбнага плана ўстаноў адукацыі рознага ўзроўню: ва ўстановах дашкольнай і школьнай адукацыі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

у музычных школах, музычных каледжах і ўстановах вышэйшай адукацыі і г. д. Да аднаго і таго ж твора педагогі могуць звяртацца на занятках па гісторыі і тэорыі музыкі, па сальфеджыю, спецінструменце, харавому і аркестраваму класам і др. Складанасць пабудовы сістэмы музычнай адукацыі, шматлікасць музычных твораў, своеасаблівасць мовы мастацтва, а таксама індывідуальна-псіхалагічныя і ўзроставыя адрозненні навучэнцаў – усё гэта актуалізуе праблему пераемнасці і бесперапыннасці ў дачыненні да вывучэння твораў музычнага мастацтва.

Праблема пераемнасці ў адукацыі асобы ў педагагічнай навуцы і практыцы з’яўляецца актуальнай з даўніх часоў. Розныя аўтары разглядаюць пераемнасць як заканамернасць, прынцып, умову, фактар, спосаб, правіла, сродак і т. п. Разнастайнасць падыходаў да вызначэння сутнасці пераемнасці толькі паказвае на шматпланавасць і шматграннасць гэтага паняцця. Філасофская сутнасць пераемнасці звязана з захаваннем элементаў цэлага ў працэсе яго развіцця. «Пераемнасць носіць аб’ектыўны і ўсеагульны характар, выяўляючыся ў прыродзе, грамадстве і пазнанні» [2, с. 514]. Яна з’яўляецца найважнейшым бокам двух асноўных дыялектычных законаў – адмаўлення адмаўлення і пераходу колькасных змен у якасныя і разглядаецца не толькі ў філасофскім, але і ў сацыяльным і педагагічным аспектах.

Сучаснае разуменне праблемы, сутнасць пераемнасці, яе месца і ролі ў цэласным педагагічным працэсе раскрываюцца ў працах Б. Г. Ананьева, Ш. І. Ганеліна, А. Р. Мароза, В. М. Мадзігона, С. М. Годніка, А. А. Кыверралга, Ю. А. Кустава, А. П. Сманцэра, А. В. Батаршэва, Л. А. Савінкова і інш. Псіхолага-педагагічныя аспекты праблемы пераемнасці разглядаліся Л. С. Выгоцкім, С. Л. Рубінштэйнам, А. У Брушлінскім, А. М. Лявонцьевым і інш. Пры гэтым пераемнасць у адукацыі разумеецца як адна з неабходных умоў забеспячэння станаўлення і развіцця асобы дзіцяці, яго далейшай жыццядзейнасці; як бесперапыннасць на розных этапах навучання (дзіцячы сад – школа – ВНУ); як адзіная арганізацыя гэтых этапаў або формаў навучання ў рамках цэласнай сістэмы адукацыі. Этапы развіцця асобы вызначаюць ступені і ўзроўні бесперапыннай адукацыі, патрабаванні і ўмовы рэалізацыі яе канкрэтных мэтаў. У залежнасці ад таго, узгодненасць якіх кампанентаў адукацыйнага працэсу даследуецца, пераемнасць разглядаецца ў гарызантальнай плоскасці

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

(паміж асобнымі бакамі, часткамі, этапамі педагагічнага працэсу ў межах адной прыступкі адукацыі) і ў вертыкальнай плоскасці (паміж рознымі ступенямі сістэмы адукацыі).

Пры ўсёй разнастайнасці і варыятыўнасці адукацыйных праграм розных узроўняў і ступеняў паміж імі практычна адсутнічаюць скразныя лініі, якія б улічвалі адзінства мэтаў, зместу, выбар найбольш аптымальных формаў, метадаў, сродкаў эфектыўнай мастацка-эстэтычнай адукацыі, ацэньвання і дыягнаставання дасягненняў навучэнцаў. Не заўсёды ўлічваецца ўзровень іх мастацка-эстэтычнай выхаванасці і сацыяльнага і асобаснага развіцця. Гэта тлумачыцца многімі аб'ектыўнымі і суб'ектыўнымі прычынамі. Сярод іх найбольш істотныя – факты дыскрэтнасці мастацкай адукацыі на пэўных этапах узроставага развіцця асобы, часам залішняя аўтаномнасць і ізаляванасць ступеняў адукацыі, недастатковая прафесійна-педагагічная кампетэнтнасць выкладчыкаў.

Улічваючы разнастайнасць формаў мастацкай адукацыі, варта адрозніваць знешнюю бесперапыннасць (пераемнасць), г. зн. арганізацыйны пераход навучання на больш высокую ступень, і ўнутраную бесперапыннасць (пераемнасць), якая вызначана суаднесенасцю зместу адукацыі на кожнай папярэдняй і наступнай ступенях. Гэта адносіцца да ўсёй сістэмы мастацкай адукацыі ў дачыненні да яе як адносна аўтаномных падсістэм (агульнай і прафесійнай адукацыі) адукацыі, так і нацыянальнай сістэмы мастацкай адукацыі ў цэлым.

Такім чынам, мастацкая адукацыя – бесперапынны працэс, расцягнуты на ўсё жыццё. У аснову адбору і выкарыстання ў педагагічных мэтах твораў музычнага мастацтва як важнейшага элементу зместу адукацыйнага працэсу неабходна пакласці прынцып яго непарыўнасці і пераемнасці, што прадугледжвае мэтавае і змястоўнае адзінства ўсёй сістэмы бесперапыннай адукацыі, распрацоўку і прыняцце адзінай сістэмы мэтаў і зместу адукацыі ў адпаведнасці з патрабаваннем «адукацыя праз усё жыццё».

1. *Абдуллин, Э. Б.* Теория музыкального образования : учебник / Э. Б. Абдуллин, Е. В. Николаева. – М. : Академия, 2004. – 336 с.

2. Большая советская энциклопедия. – Изд. 3-е. – М. : Сов. энцикл., 1975. – Т. 20. – 531 с.

3. *Кузьмініч, М. Л.* Тэарэтычныя асновы методыкі музычнай адукацыі : вучэб.-метад. дапам. / М. Л. Кузьмініч. – Мінск : НББ, 2013. – 364 с.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ